Віктар Сазонаў



...Хто ня ўмее сьмяяцца з непрыяцеля,
ніколі яго не пераможа.
А хто ня ўмее пасьмяяцца з сябе,
варты толькі сьмеху іншых...

# Маленькія гісторыі з вялікай палітыкі

***У канцы васьмідзясятых гадоў дваццатага стагоддзя на вялікіх абшарах СССР сталі масава паўставаць нефармальныя суполкі. Беларусь не была выключэньнем. Афіцыйная савецкая прапаганда бэсьціла “нефармалаў” апошнімі словамі. А мы зьбіраліся і марылі пра Незалежнасьць. І ня толькі марылі. Але і здабывалі. З цягам часу “нефармалы” ператварыліся ў “адраджэнцаў”, адраджэнцы ў “сьвядомых”, сьвядомыя ў “дэмакратаў”, дэмакраты ў “палітыкаў”, а тыя палітыкі, якія і надалей дбаюць пра Адраджэньне, дэмакратыю і Незалежнасьць, ператварыліся ў “апазіцыянераў” ці, дакладней, у апазіцыйных палітыкаў.***

***З таго часу, калі нефармалы не маглі нават уявіць, што некалі будуць палітыкамі, прайшла, здаецца, цэлая эпоха. За плячыма засталося мноства***

*Часопісны варыянт.*

***нязьдзейсьненых мараў, безьліч нявырашаных пытаньняў.***
***Зноў трэба непакоіцца пра нашую Незалежнасьць…***
***Але мы ня толькі змагаліся, але і жылі: радаваліся, весяліліся,***
***умелі кахаць і сябраваць, гадаваць дзяцей, сустракацца з роднымі,***
***глядзелі на жыцьцё па-філасофску і з гумарам. І ніколі не былі занудамі.***
***Дык успомнім яшчэ раз пра тыя цікавыя недарэчнасьці і ўсьміхнёмся.***
***І раскажам іншым. Хай таксама пасьмяюцца. Бо хто ня ўмее сьмяяцца***
***з непрыяцеля, ніколі яго не пераможа. А хто ня ўмее пасьмяяцца з сябе,***
***варты толькі сьмеху іншых.***

## Мітрапалітык

– Тэма нашага сёньняшняга семінару – ідэальны палітык. Палітык палітыкаў. Якім павінен быць кандыдат у дэпутаты, каб здабыць галасы большай часткі суайчыньнікаў сваёй акругі дакладна ў той час, калі яны становяцца электаратам, – мяркуючы заінтрыгаваць прысутных, адразу па тэме пачаў лектар. – Дык якім жа мусіць стаць гэты чалавек. Гэты суперпалітык. Я б нават сказаў – максіпалітык.

– Паколькі большасьць насельніцтва Беларусі, нават у той момант, калі яны становяцца выбаршчыкамі, застаюцца па-ранейшаму праваслаўнымі, то я б гэтага звышпалітыка на ўсякі выпадак называў бы мітрапалітык, – жартуючы, унёс папраўкі ў лекцыю нехта з прысутных.

– Я бачу, вы можаце аналізаваць, – пахваліў лектар. – Толькі сёньня мы пагаворым пра зьнешні выгляд… э-э, як вы там сказалі… мітрапалітыка. Цудоўна. Назва мне падабаецца. Бліжэй да тэмы. Большасьць людзей галасуюць за тое, што бачаць. За ваш партрэт. За ваш зьнешні выгляд. Многія ўпершыню ўбачаць контуры вашай фізіяноміі толькі на выбарчай дзяльніцы, на партрэце. А людзі ў большасьці сваёй цягнуцца туды, дзе больш сьвятла.

– Як матылі ў вогнішча? – нехта з прысутных вырашыў зьбянтэжыць лектара.

– Менавіта так! Таму зьнешні выгляд мае неверагодна вялікае значэньне, – упэўнена адказаў той. – Каб з вас, звычайных местачковых палітыкаў, атрымаліся, як вы там казалі, мітрапалітыкі, папрацаваць трэба больш, чым над кульгавай смаркатай вясковай таўстухай, якая мусіць выйграць конкурс “Міс сьвету ўсіх часоў і народаў”. Таму як вы павінны выглядаць, вы мусіце ведаць лепш, чым нумар вашай выбарчай акругі. Палітык можа ня ведаць, як правільна пішацца: Іран ці Ірак, можа не арыентавацца, да якой моўнай групы належыць лацінаамерыканская мова і нічога не разумець у тым, ці мяжуюць паміж сабой Азія і Еўразія, але мусіць добра ведаць, які гальштук падабаецца таму чалавеку, які яшчэ не пазначыў птушачкай прозьвішча свайго абраньніка ў дэпутаты. Што больш імпануе выбаршчыку? Упэўнены позірк Пазьняка ці задумлівы выраз твару Вячоркі? Напор Калякіна ці разважлівасьць Шушкевіча? Спакой Мілінкевіча ці палкасьць Казуліна? Настойлівасьць Лябедзькі ці вашыя сонныя морды на маёй лекцыі?

Пасьля такога папроку прысутныя пачалі прачынацца. Гэтыя людзі, а збольшага тут сабраліся лідэры рэгіянальных апазіцыйных структураў, за свой жыцьцёвы вопыт засвоілі толькі адно выбарчае правіла – выбары выйграе той, хто лічыць галасы. І як ён выглядае, выбаршчыкі могуць і ня ўбачыць. Тым больш ніколі не даведаюцца, што той думае… А лектар працягваў ціснуць на псіхіку:

– Паглядзіце на прысутных і, паклаўшы руку на сэрца, шчыра, як у п’янага папа на споведзі, адкажыце, за каго прагаласавалі б асабіста вы?

Хлопцы пачалі круціць галовамі. Пасьля ўчарашняга спатканьня старых сяброў, якое ў беларусаў пакуль што мае толькі адну традыцыю адзначэньня, іх фасадныя часткі сапраўды не цягнулі на назву “мітрапалітычных”. Ды і іншыя дробязі,

пачынаючы ад вопраткі і заканчваючы манерамі трымацца не выдавалі ў прысутных джэнтэльменства.

– Агіднае відовішча, – падсумаваў убачанае Лявон. – Што да мяне, дык я не прагаласаваў бы ні за адзін убачаны тут твар, хоць даўно ведаю гэтых людзей і з большасьцю сябрую.

– Сапраўды, трэба быць больш уважлівымі да свайго зьнешняга выгляду, – падхапілі іншыя. – Тут лектар мае рацыю.

– Вось, – узрадаваўся той, хапаючы паперы і зьбіраючыся выходзіць. – Бачу, маё навучаньне не прайшло дарма. Рады буду ўбачыць вас у дэпутацкіх крэслах, а можа нават і ў прэзідэнцкім. І спадзяюся, што мая лекцыя дапаможа вам у гэтым.

– Дзякуй за добрае пажаданьне, – неяк ці то з хітрынкай, ці то жартуючы, хорам адказалі ўдзячныя вучні. – Каб ня вы, то нізашто мы ня выйгралі б аніякіх выбараў. А зараз будзем дзяліць прэзідэнцкае крэсла на нас усіх. Мяркуем, што яно такое вялікае, што ніхто не застанецца абдзеленым. Дзякуй за пачутую навуку ад таго, хто сам ні разу ў выбарах ня ўдзельнічаў. Вы ж бы прэзідэнтам сталі з вашымі ведамі. А мы вось зараз і пачнём абмяркоўваць, як зрабіць так, каб для жанчынаў выглядаць як замежны альфонс, для старых людзей як надбаўка да пенсіі, для малых як добры чарадзей з цукеркамі, а для астатніх – як дармовая пляшка гарэлкі.

– І яшчэ да вас ёсьць адно пытаньне, спадар Балдзею-ад-сябе, – зьвярнуўся Лявон да лектара, ужо і так разгубленага апошнімі жартамі прысутных. – Ці нават прапанова. На наступнай лекцыі, калі ласка, давядзіце нам, як гэта ўдалося выйграць выбары, прыкладам, Уінстану Чэрчылю, які відочна не прыслухаўся б да вашых рэкамендацыяў…

## Нечаканая сустрэча

– Ах вы гады, ну трымайцеся! Я вам зараз накастыляю так, што доўга будзеце памятаць. Рабіць вам няма чаго. Мітынгі надумалі ладзіць. Я вам сёньня адаб’ю ахвоту выходзіць на вуліцу, нават каб прагуляцца з дзяўчынай, – плюючыся, крычаў малады міліцыянт АМАПу.

Ніякіх гадаў, да якіх ён зьвяртаўся, нідзе паблізу не было. Але Ваня, так яго звалі, ужо махаў міліцэйскай дубінай. Да апазіцыі ў яго заўсёды была нейкая маніякальна-параноідная злосьць. Ці гэта так паўплывала на маладыя несасьпелыя мазгі агітацыя старэйшых афіцэраў АМАПу на палітзанятках, ці перадалося з генамі ад дзеда, старога чэкіста, якога яшчэ ў часы Сталіна прыслалі з Тамбову на Беларусь змагацца з усімі, з кім захоча, абы толькі змагацца, Ваня і сам ня ведаў. Але заўсёды з радасьцю ўспрымаў загад разагнаць які-небудзь мітынг, або затрымаць каго беларускамоўнага. А ў гэты дзень яго нянавісьць памножылася ў тры разы ў кубе і шырылася па законах геаметрычнай прагрэсіі. Акурат сёньня мела адбыцца сямейнае сьвята. Малодшая сястра надумалася ўрэшце пазнаёміць сям’ю з кавалерам. З нейкім студэнтам пятага курсу нейкага інстытуту (Ваню цяжка даваліся назвы навучальных установаў), які павінен уліцца ў іх сям’ю ў якасьці бацькі дзіцяці ягонай сястры...

Малады амапавец рыхтаваўся да гэтай сустрэчы мацней, чым да канспектаваньня апошняга выступу міністра ўнутраных справаў. Нават купіў маладой пары падарунак: пяцімесячнага сабаку пароды бультэр’ер, які ўжо пасьпеў пазначыць сваю тэрыторыю на ўсёй хатняй мэблі і падзёрці дываны ды абутак. Зьбіраўся раней прыйсьці з працы (калі яго род заняткаў так можна назваць), а тут на табе. Нейкія маладафронтаўцы зрабілі пікет, што ставіла крыж на планах першым сустрэць будучага сваяка.

…Праз некалькі хвілінаў атрад АМАПу ўжо прыціскаў да сьцяны некалькіх юнакоў, якія раздавалі ўлёткі на незразумелай для беларускіх ахоўнікаў парадку беларускай мове. Ваня адразу прыгледзеў сабе ахвяру – маладога хударлявага хлоп-

ца з бел-чырвона-белым значком на швэдары. Паўтарыўшы некалькі разоў свае аргументы ў выглядзе ўдараў па плячах дубінкай, амапавец хапіў маладафронтаўца за руку і пацягнуў у міліцэйскую машыну. Але той спрытна выкруціўся з Ванявых абдымкаў і з абяцаньнем: “Сустрэнемся, калі будзеш бяз палкі”, паказаў кастлявы кулак і зьнік у натоўпе зявак.

Дахаты міліцыянт вяртаўся ў нялепшым настроі. І на сустрэчу з кавалерам сястры прыйдзе са спазьненьнем, і нікога не ўдалося затрымаць. Яго калегі пахапалі рэшту пікетчыкаў і зацягнулі ў пастарунак. А ён толькі час згубіў. З галавы, у якой думкі разьляталіся як спалоханыя стрэлам вароны, ніяк не зьнікаў вобраз таго хлопца, які мала што змог вырвацца са спрактыкаваных міліцэйскіх лапаў, але яшчэ і адважыўся выказаць пагрозы. Вось бы яго яшчэ калі ўбачыць, каб адпомсьціць. Але дзе ты цяпер яго знойдзеш.

Амапавец баяўся, што кавалер сястры яго не дачакаецца. Гэта ўжо будзе трагедыя. Ён адмыслова падрыхтаваў застольную прамову на цэлую хвіліну, якую запамінаў тры дні, і ведаў, што да наступнага разу ён яе забудзе. Добра, што калегі падкінулі яго дахаты на міліцэйскай машыне. Шанец убачыцца сёньня яшчэ быў.

– А вось і я! – радасна, надаўшы свайму голасу максімум мужчынскасьці, выбухнуў ён, зайшоўшы ў кватэру і ўбачыўшы ў калідоры чужы абутак, які даядаў бультэр’ер.

– Ванюша прыйшоў з работы, – запішчала задаволеная сястра і весела дадала. – Пазнаёмся, калі ласка, гэта Сьцяпан, мой хлопец.

Ваня, здымаючы куртку праз галаву, працягнуў руку новаму знаёмаму. Ён убачыў хударлявую далонь, якая не дацягнуўшыся нейкага там сантыметру да яго пальцаў, моцна сьціснулася ў кулак. Амапавец ірвануў куртку назад і падняў вочы на госьця. Перад ім, ужо прыцэліўшы кастлявы кулак для моцнага дакладнага ўдару, стаяў той маладафронтавец, якога дзьве гадзіны таму не ўдалося зацягнуць у міліцэйскую машыну…

## Папера ад апазіцыянера

Калі Васіль пачуў у слухаўцы знаёмы голас маёра мясцовай міліцыі, ён і не падазраваў, што гэта будзе за размова. Напачатку кіраўнік тутэйшага БНФу вырашыў, што яго чарговы раз зьбіраюцца папярэдзіць, каб той не праводзіў несанкцыянаванага мерапрыемства. Напярэдні першага верасьня хлопцы рыхтаваліся да ўлёткавай акцыі. Трэба ж неяк рэагаваць на зьнішчэньне апошніх беларускамоўных класаў у школах.

Але голас маёра быў неверагодна ласкавым:

– Калі на тое будзе вашая згода, я сустрэўся б з вамі на нейтральнай тэрыторыі, скажам, у парку. Калі ласка, прыйдзіце адзін, – спакусьліва сьпяваў маёр. – Не адмоўце. Вельмі трэба.

Інтрыга. Вось што штурхнула Васіля на тую сустрэчу. Ён быў настолькі заінтрыгаваны гэтым таямнічым спатканьнем, што нават расейскія танкі не перашкодзілі б яму прыйсьці ў парк своечасова.

– Няўжо ў сталіцы нашыя перамаглі, і вы надумаліся правесьці са мной перамовы, каб і надалей захаваць сваю пасаду, – бухнуў Васіль пасьля прывітаньня.

– Барані Божа! – зьбялеў маёр і зьбянтэжана наклаў левай рукой на сябе крыж. У правай трымаў нейкія паперы.

– А што тады? Няўжо вы думаеце, што патаемныя сустрэчы з афіцэрамі міліцыі – маё хобі.

Афіцэр міліцыі нервова стаў азірацца, нібыта зьбіраўся перадаць апазіцыянеру дакументы з усімі дзяржаўнымі таямніцамі.

– Ведаеце што… – прамурлыкаў маёр. – Я думаю, вам ня трэба на мяне трымаць

крыўды. А што вас арыштоўваем, дык работа такая. Але ж мы не па злосьці. Загад ёсьць загад. Мусім выканаць. Хоць вас мы паважаем. Праўда! У нас усе ў аддзеле захапляюцца вашай мужнасьцю. Мы, калі хочаце ведаць, нават ганарымся вамі. Добра, што вы ёсьць.

– А падчас мінулага затрыманьня казалі, што гэта кепска, – засьмяяўся Васіль. – Пяройдзем да справы.

– Добра. Ня буду прыдурвацца. У мяне сын у Англіі. Ёсьць мажлівасьць атрымаць добрую працу. Але ж ведаеце гэтых еўрапейцаў… Ёсьць праблема з яго знаходжаньнем там. Трэба даведка, што ён актыўны БНФавец. Калі вы мне яе зробіце, буду старацца і я для вас штось рабіць… Узор я прынёс. І яшчэ просьба: як вам патэлефануюць адтуль, каб даведку праверыць, то пацьвердзіце, што мой сын сапраўды апазіцыянер.

– Ну што ж, – задумаўся Васіль. – Атрымліваецца, што я сваім змаганьнем і арыштамі ды немажлівасьцю сабе знайсьці працу на кар'еру вашага сына працую. Добра. Дам я вам даведку. З пячаткай. Людзі мы ня злапамятныя. Узору вашага ня трэба. У мяне для вас ёсьць свой узор. Толькі сустрэнемся пасьля першага, калі вы мяне не пасадзіце. А то ў нас акцыя. Мяркую, вы ведаеце.

Маёр кіўнуў галавой і зьнік у цемры вечару.

Апазіцыйная акцыя першага верасьня прайшла надзвычай удала. Нікога не затрымалі, нават не спрабавалі. А другога маёр з задавальненьнем даставаў з паштовай скрынкі паперыну з пячаткай БНФ. Ён беражліва, як звышсакрэтны дакумент Міністэрства ўнутраных справаў, разгарнуў яе і ўрэзаўся вачыма ў тэкст. Там, над подпісам кіраўніка мясцовай партыйнай арганізацыі БНФ, было напісана:

"Шаноўныя ангельскія чыноўнікі. Просім не выганяць з Англіі сына нашага маёра. Па-першае, нават яго кумір таварыш Сталін казаў, што сын не адказвае за бацьку. Па-другое, наш маёр нядаўна даказаў, што ён зусім не перакананы ў тым, што дэмакратыя і дэмакраты – гэта кепска. Як высьветлілася, у яго ўвогуле няма аніякіх перакананьняў. Хай яго сын пабудзе ў вас, каб набыць хоць нейкія. Тым больш, што яго бацька зарабіў на тое – не арыштоўваў нас пад час апошняй акцыі, як гэта рабіў раней.

*P.S.* Таварыш маёр. Падобную паперу вы зможаце атрымліваць пасьля кожнай нашай акцыі".

## Забароненыя колеры

Раней я думаў, што тэорыя ўплыву колераў на настрой чалавека – вынік несяброўства з уласнай галавой псіхааналітыкаў. Адмыслова ўзяты для супакаеньня зялёны колер сталоў казіно наўрад чым можа дапамагчы нярвоваму стану чалавека-разумнага, што за адзін вечар «прадуў» здабытак усяго жыцьця. Ды і зялёныя грошы амерыканскага народу мала каго пакідаюць у спакоі. Нават дальтонікі ня могуць застацца абыякавымі, убачыўшы ў чужых руках стос зялёных паперак з партрэтамі амерыканскіх прэзідэнтаў.

Але калі беларускае заканадаўства забараніла выкарыстоўваць пэўнага колеру сімволіку, а міліцыянты пачалі кідацца на бел-чырвона-белыя сьцягі як бык на чырвоную анучу, мне давялося перагледзець свае погляды на сьцверджаньні спецыялістаў па вывучэньні масавых псіхічных адхіленьняў дарослых прадстаўнікоў чалавечай расы. Самае дзіўнае ў паводзінах міліцыянтаў – тое, што яны раней гэтую сімволіку насілі на сваіх мундзірах...

…Было гэта ў Брусэлі. Другая палова дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя. Ужо за выкарыстаньне бел-чырвона-белых сьцягоў у Беларусі арыштоўвалі, давалі штрафы, кідалі за краты. Але апазіцыянеры спадзяваліся, што ўдасца нейк павярнуць краіну на шлях еўрапейскай дэмакратыі нават з той уладай, якой старадаўняя

нацыянальная сімволіка папярок гарляка стала, як каса авечцы. Былі надзеі на тое і ў еўрапейцаў. Таму яны і запрасілі ў Брусэль на нейкі там семінарчык групу, якая напалову складалася з прадстаўнікоў улады, а напалову з апазіцыянераў. Доўга еўрапейскія эксьперты расьпіналіся пра здабыткі еўрапейскага ладу жыцьця, а пасьля вырашылі паказаць свой слаўны горад.

Надвор'е выдалася не найлепшае для турыстыкі. Дождж з дажджом. І яшчэ крыху дажджу. Еўрапейцы нават замаркоціліся. Падумалі, што і гэтая частка праграмы правалілася. Але беларусам горад спадабаўся. Асабліва крамы ды бары. Дакладней, тое, што там прадавалася. Апазіцыянеры павесялелі. Сталі жартаваць. Прадстаўнікі беларускай улады папрачыналіся. Усе разам так энергічна займаліся скупкай таннага тавару, што брусэльцы, гледзячы на іх, пачалі пытацца, ці не пачалася якая глабальная прыродная катастрофа.

А еўрапейскія эксьперты, узрадаваўшыся, што хоць нешта атрымліваецца, купілі беларусам па парасончыку. Хай, думаюць, ад дажджу хаваюцца.

Ды вось не ўлічылі заўвагі ўсё тых жа псіхааналітыкаў... Парасончыкі былі з белымі і чырвонымі палосамі. Напачатку імі карысталіся ўсе, спрытна перабягаючы ад крамаў да бараў і наадварот. Ды пасьля група зноў падзялілася на дзьве часткі. Нехта ўзяў ды пажартаваў, што сфатаграфуе, як дэлегаты ад улады разам з апазіцыянерамі гуляюць па Брусэлі пад бел-чырвона-белымі парасончыкамі, і пашле здымкі прэзідэнту. "Уладнікі" ад гэтых словаў канчаткова прачнуліся. Не згаворваючыся, яны падаліся да сьметніцы і пачалі выкідваць парасоны.

Дождж яшчэ больш узмацніўся. Разгубленыя еўрапейскія арганізатары семінару паглядалі на беларускую дэлегацыю і не маглі ніяк уцяміць: займаюцца, здаецца, адным і тым жа – не зьвяртаючы ўвагі на архітэктурныя помнікі, купляюць тавары і паглынаюць піва. Але чаму палова групы гуляе пад парасонамі, а другая, ня гледзячы на тое, што вада псуе набыты тавар і да ніткі ўжо іх прамачыла, упарта адмаўляюцца ад падарункаў.

"Можа, пакрыўдзіліся, што парасоны мы ім занадта танныя купілі", – падумаў кіраўнік арганізатараў. – "А можа, дажджу ніколі ня бачылі. Халера іх разбярэш, гэтых беларусаў".

## Нюансы перыферыі

Калі вы ніколі не былі ў Сьвіслачы, невялічкім раённым цэнтры, што на Гарадзеншчыне, то ўсе іншыя паездкі ды вандроўкі вашага жыцьця ня маюць аніякага сэнсу. Вы проста цягаліся, як той дурань з торбай, і ў кожным новым месцы сумавалі ад занудлівай логікі пазнанага.

У Парыжы можна паглядзець толькі Парыж. Эйфелевая вежа ці Елісейскія палі – гэта толькі дадаткі да Парыжу. Іх вы ўжо неаднаразова бачылі на здымках, рэкламных шчытах, у кінафільмах... Яны – проста Парыж. У Менску, Варшаве ці Берліне вы ўбачыце адно і тое ж: мітусьню людзей вялікага гораду. Можа, нават атрымаеце пэўную асалоду ад іх разгубленых, дэзарыентаваных інтэнсіўнасьцю жыцьця твараў. У Маскве вы проста заблукаеце і ня зможаце пазбавіцца адчуваньня, што заехалі занадта далёка ад сваёй планеты. А вось пасьля наведваньня Сьвіслачы (Божа мой, Сьвіслачы!), знакамітая кніга Гінэса падасца сумнымі занатоўкамі для гультаёў.

Чаго вартая толькі адна "славутая" "Алея герояў". Перад уваходам вас вітае інтэрнацыянальная, ці калі выслаўляцца па сэнсе, антынацыянальная савецкая зорка і прывітальны надпіс украінскіх нацыяналістаў "Слава героям". Кожнаму, хто гэта бачыць, хочацца стаць стромка, з імпэтам перакананага нацыяналіста адказаць надпісу: "Героям слава!" ды засыпаваць інтэрнацыянал зорцы. А на самой алеі стаяць адзін каля аднаго помнікі Сталіну і Траўгуту, Леніну і Кастусю Каліноўскаму. Чаму

гэтых ідэалагічных антыподаў аўтары праекту паставілі разам, растлумачыць проста. У Сьвіслачы навучыліся гнаць вельмі моцную самагонку, якую мясцовыя аматары нездаровага ладу жыцьця называюць “карчоўка”. Хіба таму, што вырабляюць яе пад карчамі ў Белавежскай пушчы. А можа таму, што гоняць з карчоў (наконт гэтага спрэчкі цягнуцца стагоддзямі). Але хто яе пакаштуе, пачынае бачыць сэнс жыцьця ў абсурднасьці. Відаць, мясцовыя ўлады з перапою і залічылі ў героі беларускага народу ўсіх асобаў, помнікі якім мелі.

Да 1994 году ўлада і апазіцыя жылі ў Сьвіслачы па-прыяцельску. Віталіся, размаўлялі, часамі пагаджаліся ў поглядах. І гэта дзякуючы ўсё той жа карчоўцы. Людзі там шчырыя. Прыкметаў агрэсіўнасьці няма на генетычным узроўні. Мабыць, зямля такая добрая. Там нават сабакі гуляюць з зайцамі. У даганянкі… А вось пасьля зьмены ўлады ў Менску мірнае суіснаваньне розных палітычных поглядаў, нават у межах аднаго асобна ўзятага раённага цэнтру, закончылася. Дайшло аж да арыштаў.

Надумаліся неяк апазіцыянеры ўшанаваць памяць паўстанцаў 1863 году. Пайшлі на магілу Віктара Каліноўскага, паклалі кветкі. Нікога не чапалі. А ўлады чамусьці засталіся незадаволенымі. Ці таму, што іхнім Сталіну з Леніным не было каму кветак купіць, ці хто вышэй загад аддаў. Пахапалі міліцыянты апазіцыянераў, ды прыцягнулі ў пастарунак. А што далей рабіць – ня ведаюць. Мітусяцца, круцяцца, як вошы на грэбні, кансультуюцца па тэлефонах. Начальнік мясцовай міліцыі, хіба каб час зацягнуць, нават пачаў прыдурвацца, асабліва перад гарадзенскімі гасьцямі, якія таксама завіталі на тую імпрэзу:

– Хлопцы, я ж за вас. Проста ў мяне работа такая. Халера б яе ўзяла. Я ж за вашага Пазьняка галасаваў. І за гэтага... як яго... забыўся. Магу пабажыцца (тут ён чамусьці зірнуў на партрэт прэзідэнта, што вісеў у кабінеце, і бажыцца перадумаў). Вы мне падпішыце пратаколы, а я скажу знаёмаму суддзю, каб да вас не прыдзіраўся. У нас тут усе сваякі, што ў судзе, што ў міліцыі. Дасьць вам толькі папярэджаньні...

Суд пакараў кожнага даляраў на васемсот. З залы выйшлі дзьвюма рознымі групамі. Міліцыянты, якія на гэты раз былі па сумяшчальніцтву хлусьлівымі сьведкамі, выцягнуліся асобна. Апазіцыянеры, ці на праўнай мове гэтага дня – абскарджаныя, таксама асобна. Кінуўшы ў бок фальшывых сьведкаў пару-тройку выслоўяў з расейскай мовы, апазіцыянеры рушылі да бліжэйшай кропкі продажу карчоўкі. Там яны яшчэ раз убачыліся з прадстаўнікамі праваахоўных органаў, якія планавалі зрабіць тое ж самае...

Карчоўка скончылася апоўначы. Таму аднаму з апазіцыянераў давялося пайсьці ў рэстаран па дабаўку. А там, расхрыстаўшы мундзіры, сядзелі тры міліцыянты. Апазіцыянера як чорт намовіў. Ён сеў да іх за столік, наліў сабе іхняй гарэлкі, выпіў і спакойным, як у белавежскага зубра, рыкам зьвярнуўся да разгубленых ахоўнікаў парадку.

– Ну што, сябры, папаліся. Мы сфільмавалі на відэастужку, як вы тут прапіваеце свой сабачы хлеб. Заўтра перашлём яе ў Менск. Вашае ж начальства вас і папрэ з працы. А вы думалі, мы не адпомсьцім?

Адзін з міліцыянтаў пачаў азірацца і закрываць рукамі пагоны. Другі захіліў твар. А трэці штосьці хацеў адказаць, але нечакана для сябе закрыў рукой рот. Праз хвіліну, як па камандзе, яны кінуліся да дзьвярэй.

Ніхто з прысутных гэтаму факту не зьдзівіўся. У сьвіслацкіх своеасаблівы тэмперамент. Толькі маладая афіцыянтка зьвярнулася да апазіцыянера:

– Мы за вас прагаласуем на выбарах. Абавязкова. Толькі не паразганяйце з рэстарану рэшту кліентаў.

## Золата партыі

Заўважыў я пасьля прайграных выбараў, што знаёмыя і суседзі, якія напачатку нібыта ставіліся да маёй дзейнасьці з павагай, нават дапамагалі на выбарах, пасьля майго пройгрышу сталі адносіцца да мяне “несур’ёзна”. Нават некаторыя падсьмейваліся. Што, маўляў, апазіцыянерчыкі, ні чарта вы зрабіць ня можаце і нічога ня вартыя. І няздольныя ні на што.

Мяне гэта вельмі турбавала. Бо менавіта на гэтых людзей увесь разьлік. І тлумачыў я ім, і даводзіў розныя думкі – усё марна. Як гарохам аб сьцяну. Хоць ім кол на галаве чашы. Не даходзіць. Ніхто і слухаць ня хоча. Лепш купяць бімбару ў краме, зальюць мазгі, і толькі тады цябе прызнаюць, калі ты з імі разам цяпнеш шклянку-другую...

А апазіцыя зноў да выбараў пачала рыхтавацца. Навучальныя семінары пайшлі. Дай, думаю, і я зьезджу на які. Можа, што новае пачую, як зноў давер у людзей набыць. Семінар тады ладзілі ў Варшаве. Нічога новага я не пачуў і нічога забароненага з сабой ня вёз. Але ўлада меркавала інакш. Затрымалі мяне з яшчэ адным знаёмым на мяжы, і паперы нейкія пад нос сунуць. Маўляў, усе, ад каго гэта залежыць, далі згоду, каб нас абшукаць і ўсё, што хочуць, забраць. І на тых паперах свае аўтографы паставілі ўжо.

Спрачацца мы ня сталі. Тым больш, што кішэні пустыя. Усё ў галаве перавозім. Але на мытні ў нас усё штосьці шукалі ў вопратцы. Што там магло быць? Я ажно падумаў, што ўлада лічыць нас яшчэ дурнейшымі, чым тыя, хто ніяк ня можа зразумець, чаму людзі сунуцца ў палітыку.

Колькі нас ні трымай, а адпускаць трэба. Проста непрыемна на душы было. Вярнуўся, называецца, на Радзіму. А Радзіма сустрэла раскрытымі кайданкамі. Ды і знаёмыя, мяркую сам сабе, яшчэ больш сьмяяцца будуць. Ды яшчэ чуткі распусьцяць якія, што замежныя грошы перавозіў. Бо так казалі тыя, хто абшукваў.

Але найбольш я быў уражаны назаўтра. Мае знаёмыя і суседзі глядзелі на мяне з нейкай таямнічай павагай, як падлеткі на майстра каратэ, кунфу і боксу разам. Нейкія газеты перадавалі адзін другому, да мяне падыходзілі і таямніча-даверлівым прыцiхлым голасам казалі, што калі мне будзе патрэбная нейкая дапамога, дык магу на іх разьлічваць. Яны ня толькі могуць дапамагчы, але і хочуць гэта зрабіць, і нават настойваюць на гэтым.

Майму зьдзіўленьню не было межаў. Я таксама купіў газету і ўбачыў артыкул, які саркастычна-жартаўліва апавядаў, зьдзекуючыся з уладаў, што ў мяне на мяжы шукалі золата партыі. Зразумела, што партыя апазіцыйная, а золата замежнае. Такое прыгожае, у зялёных паперках з партрэтамі амерыканскіх прэзідэнтаў. І нібыта вельмі шмат таго золата хацелі знайсьці. Толькі я так яго схаваў, што найноўшая апаратура ня здолела заўважыць.

Я сеў на лаўку і доўга сьмяяўся. Не з артыкулу, а з таго, як адрэагавалі на яго людзі. Во калі зноў павага да мяне вярнулася! Не тады, калі я, страціўшы працу, адстойваў свае ідэалы, не тады, калі мяне затрымвалі, арыштоўвалі... А тады, калі знаёмыя і суседзі паверылі ў тую лухту, што мы з-за мяжы можам браць столькі сродкаў, колькі хочам. І цяпер, калі хтось падыходзіць і пытаецца, ці праўду казалі па тэлевізіі, што нам амерыканцы сорак мільёнаў даляраў далі, я заўсёды адказваю так:

– Праўда. Але гэта толькі афіцыйна. Неафіцыйна мы чакаем значна больш.

І ты ведаеш, яшчэ нікога не сустрэў, хто гэтае паведамленьне ўспрыняў бы адмоўна. Наадварот. Слухаюць неяк, я б сказаў, з павагай і шкадаваньнем, што яны раней не ўступілі ў якую-небудзь апазіцыйную партыю.

## Сьцяг у рукі

– Чарговыя зьвесткі пра чарговы этап інтэграцыі Беларусі і Расіі чарговы раз прымусілі нас, мясцовых апазіцыйных палітыкаў, сабрацца разам, каб вырашыць пытаньне з чарговым мерапрыемствам, на якім чарговы раз засьведчыць, што палітыка беларускіх уладаў цалкам разыходзіцца з думкай беларускага народу, які нізашто не палезе ў чарговую маскоўскую авантуру, нават калі чарговы раз прагаласуе на рэферэндуме за чарговую інтэграцыю… – выдыхнуў Міхась і ўважліва паглядзеў на прысутных.

Ён зусім нядаўна стаў кіраўніком мясцовай філіі партыі БНФ. Многія, нават тыя, хто яго абіралі, пасьмейваліся, іранізавалі з Міхасёвай манеры гаварыць, трымацца, апранацца, але шанавалі за адданасьць справе, руплівасьць і працавітасьць. Вось і цяпер ён тэрмінова сабраў сход, каб нейкім чынам адрэагаваць на спробу беларускіх і расійскіх уладаў “яшчэ больш паглыбіць працэс інтэграцыі”…

– І разумееце, – працягваў Міхась, – незалежнасцю, самым сьвятым гандлююць... Мы мусім адрэагаваць. Прапаную зрабіць мітынг, на які зьбяром як мага больш удзельнікаў і растлумачым людзям бесьперсьпектыўнасьць і ганебнасьць такога кроку ўладаў. Народ нас зразумее.

– Што мы можам растлумачыць? – засумняваўся нехта з прысутных. – Многія з тых, каго мы заклікаем прыйсьці на мітынг, самі галасавалі на рэферэндуме за інтэграцыю. Трэба на мітынгу нічога не тлумачыць, а прыдумаць якое радыкальнае дзеяньне...

– Галасавалі, ды ня той рукой. А на другой руцэ пальцы трымалі крыжыкам. Так што такое галасаваньне ня лічыцца, – не пагадзіўся Міхась. – А вось наконт таго, каб прыдумаць чаго, то гэта правільна. Сябры, якія будуць прапановы?

– Давайце расейскі сьцяг спалім. Каб паказаць наш пратэст супраць навязваньня маскалямі нам сваёй палітыкі, – прапанаваў Вадзім.

– Добрая ідэя, – узрадаваўся Міхась. Ён гатовы быў падтрымаць кожную ініцыятыву, бо сваіх у галаве не вадзілася. – Хто будзе паліць? Справа сур’ёзная. Зразумела, што ўлады гэтым людзям не даруюць. Адпомсьцяць. Будуць пакараньні. І вельмі моцныя.

Прысутныя пазаціхалі. Каму ахвота на ражон лезьці. Але ж некаму трэба. Што зробіш?

– Давай мы спалім, як няма больш каму, – перамовіўшыся між сабой, пагадзіліся Віктар з Уладзімірам. – Толькі хай нехта набудзе расейскі сьцяг і прынясе на мітынг. Самі мы маскальскага сьцягу шукаць ня будзем. А там, пасьля выступу, мы яго спалім і нагамі патопчамся...

– Выдатна, – уздыхнуў Міхась. – Пошукі сьцягу я бяру на сябе. А зараз выпрацуем сцэнарый мерапрыемства.

…Тады апазіцыйныя мітынгі былі вельмі шматлюдныя. Людзі прыходзілі як на сьвята. Перш за ўсё, каб пасьмяяцца са свайго выбару – якіх яны абралі дэпутатаў… Весялей забавы не прыдумаеш, чым з сябе пасьмяяцца… Нават маючы адукацыю масавіка-весялуна. Міліцыя ў той час яшчэ не навучылася біць і арыштоўваць усіх прысутных. Зьдзеквалася толькі з арганізатараў і выступоўцаў. Таму людзі не баяліся зьбірацца пад бел-чырвона-белымі сьцягамі і слухаць апазіцыйных аратараў. Усёадно рабіць не было чаго. Па тэлебачаньні толькі пра неверагодныя “нашыя посьпехі нашай сельскай гаспадаркі” расказваюць. Звар’яцець можна ад суму. Адзін чалавек неяк заснуў, гледзячы тэлевізар, і прысьніў сон, нібыта даярка нейкага “перадавога” калгасу “Шляхам Ільліча” ўзяла ды ацялілася. Дала калгасу прыбытак адразу сем цялушак, аднаго бычка і дванаццаць парсючкоў. І за гэта мясцовага конюха сам прэзідэнт узнагародзіў ордэнам. Проста ў стайні. Той чалавек, што сон прысьніў (па прафесіі ён быў гінеколаг), прачнуўся ўвесь спацелы

і зарокся не глядзець больш беларускай дзяржаўнай тэлевізіі, а хадзіць на мітынгі апазіцыі…

На гэты раз людзей сабралася багата. Відаць, сапраўды пытаньне было важнае. Апазіцыя дзейнічала згодна з раней абмеркаваным сцэнарам, толькі выпадаў адзін важны момант – спаленьне сьцягу. Міхась як дурная мяцёлка насіўся па горадзе, каб яго набыць, але нідзе ня мог знайсьці. А іншыя апазіцыянеры бясконца выступалі на ўжо пачатым мітынгу, паўтараючы адно і тое ж, наўмысна зацягвалі прамовы, каб дачакацца дзесьці зьніклага кіраўніка мясцовай партыйнай філіі.

Нарэшце зразумеўшы, што расейскага сьцягу купіць не атрымаецца, Міхась набыў чырвоную, белую і сінюю стужкі, прыляцеў як вецер у атэлье, заплаціў, каб стужкі сшылі, і на таксі прыпёрся на мітынг. Выцягнуў з-за пазухі толькі што сшыты сьцяг і сунуў яго Віктару і Уладзіміру. Тыя з воклічамі “Жыве Беларусь!” і пад крыкі ўсіх прысутных падпалілі яго, кінулі на зямлю і з прыемнасьцю патапталіся, пакуль той дагараў. Пляваць ня сталі. Баяліся затушыць агонь...

Нейкі час хлопцы чакалі арышту. Але ніхто па іх душы не прыходзіў. Зьдзіўленьню не было канца…

Гэтая гісторыя пачала ўжо забывацца, як да Віктара і Уладзіміра ў госьці завітаў знаёмы. Ён доўга разглядаў фотаздымкі з таго мітынгу, а пасьля разгублена запытаў:

– Ну ўсё разумею: і што вы супраць інтэграцыі, і што за незалежнасьць, і за дэмакратыю... Аднаго не магу ўцяміць – чым вам Галандыя не дагадзіла?

– Якая Галандыя? – У хлопцаў валасы на галаве падняліся як у п’янага панка.

Яны вырвалі ў госьця з рук фотаздымкі і ўрэзаліся ў іх вачыма. Усё стала зразумела. Вось чаму хлопцаў не арыштавалі! Фотаздымкі сьведчылі, што замест расейскага яны спалілі галандскі сьцяг. У атэлье, дзе яго сшывалі, пераблыталі палосы…

Цікава, што думалі ў КДБ, праглядаючы відэастужку. Во загадка!

## Вернасьць абавязку

Брудная старэнькая машына з цяжкасьцю пераадолела невялічкую лужыну і, адпакутаваўшы яшчэ некалькі дзясяткаў метраў, спынілася каля брамкі апошняй хаты лясной вёскі, што ляжыць, забытая ўсім сьветам, у Дзятлаўскім раёне на Гарадзеншчыне. Штурхануўшы плячом пярэднія правыя дзьверы, вываліўся ў цемру ночы невысокі сьветлавалосы чалавек. Шафёр гэтай цуда-тэхнікі таксама паспрабаваў вырвацца з палону сваёй маёмасьці, якая, здаецца, у гэты момант памяняла статус з аўтатэхнікі на нерухомасьць, але дзьверцы з яго боку не расчыняліся...

Госьць увайшоў у брамку і пагрукаў у дзьверы хаты. Праз колькі хвілінаў яны прыадчыніліся.

– Па маю душу, якая нават чарцям непатрэбная, прыпёрліся, – грымнуў гучны бас. – Ну давайце, накладвайце кайданкі, пакуль я яшчэ сонны. А то як прачнуся, пераб’ю ўсю дзятлаўшчыну разам з мірным насельніцтвам.

– Супакойся, Валодзя, – прастагнаў начны госьць. – Дасталі мяне ўжо твае жартачкі за столькі гадоў знаёмства. Гэта я.

– О-о-о! Браце бэнээфавец! – узрадаваўся гаспадар. – А які нячысьцік цябе прынёс у наш закінуты куток? Няўжо зноў выбары пачаліся, што гарадзенскія апазіцыянеры нарэшце пра мяне ўспомнілі?

– Выбары ўжо заканчваюцца, – вяла пазяхнуў суразмоўца. – А ў Менску толькі зараз улёткі надрукавалі. Вось езджу, раздаю людзям. Каб раскідалі ды парасклейвалі. Усе галасы палічылі ўжо... Але агітацыю ўсё ж разьнесьці трэба. Так вырашылі ў Менску.

– Справа патрэбная, – абапёрся аб сьцяну Уладзімір. – Як трэба, то зраблю. Давай свае ўлёткі. Колькі там прывёз?

– Чатыры тысячы...

– Што-о-о! Ды вы там хіба павар'яцелі ўсе ў абласных цэнтрах ды сталіцы. – Паспрабаваў глянуць у вочы госьцю двухмятровы вясковы гігант. – Чатыры тысячы! Ды ў маёй вёсцы ўсяго трыста чалавек жыве. Гэта разам з малымі дзецьмі давыбарчага веку, старымі бабулькамі, што пачалі зямелькай пахнуць і чытаць даўно развучыліся, сабакамі, катамі і ўсёй скацінай разам. Мне што, ваўкам тваю агітацыю раздаваць?

– Ды не вылупляй ты на мяне свае бельмы, – прастагнаў госьць. – Заўтра апошні дзень агітацыі. Я ў Менску абяцаў, што ўсе ўлёткі пасьпею раздаць. Рабі што хочаш, але толькі забяры іх у мяне.

– Ах, ты, злыдзень, – вызьверыўся калега па апазіцыі. – Ты што, прапануеш мне іх выкінуць? Чаго тады валокся сюды? Сам бы і выкінуў.

– Я не магу. Па-першае – абяцаў раздаць. Па-другое – там партрэт нашага кандыдата, лозунгі нашыя. Не магу я. Сумленьне не дазваляе.

– А ў мяне, мяркуеш, сумленьня і вернасьці партыйным абавязкам няма? Я таксама не магу праз гэта пераступіць.

Калегі па партыі ў задуменьні селі на ганак. Памаўчалі. Першы азваўся Уладзімір.

– Тут недалёка жыве пара-тройка маладых хлопцаў. Паабяцаем на піва. Можа, яны пагодзяцца разьнесьці? Па суседніх вёсках, можа, раздадуць.

Так і зрабілі…

– На піва хлопцам маеш? – разьвітваючыся, спытаўся Уладзімір.

– Скуль? – прастагнаў абласны кіраўнік. – У мяне з выбараў 91-га году па кішэнях гуляе вецер. Ды і за што ім плаціць? Яны ж разносіць ня будуць. Выкінуць. Добра, калі таптацца па іх ня будуць...

Праз нейкі час, седзячы ў хаце яшчэ аднаго знаёмага ў Дзятлаве, ён ужо размаўляў па тэлефоне з вышэйшым кіраўніцтвам. Пасьля вельмі бадзёра выйшаў з хаты і сеў у машыну.

– Ну вось, – весела азваўся да шафёра. – У Менску задаволеныя нашай працай. Кажуць, што калі я за што бяруся, то выканаю.

– Яшчэ б ім нас не пахваліць, – узбадзёрыўся шафёр. – Пакуль яны спалі, мы за ночку на гэтым дабітым возе цэлую вобласьць аб'езьдзілі. Усе ўлёткі раздалі. Выканалі свае партыйныя абавязкі. Уклаліся ў тэрмін.

І машына, задымляючы Дзятлава, расьсякаючы пабітымі фарамі ранішні туман, сонна пасунулася ў Гародню.

## Найгоршыя людзі

Юрась Сініцкі выйшаў з агульнага паседжаньня аб'яднанай апазіцыі вынішчаны, як прафесар філасофіі пасьля працы на калгасным полі. Ад бессэнсоўных спрэчак разбалелася тое месца, якім да паседжаньня яму ўдавалася думаць. Юрась здрыгануў паветра некалькімі непрыстойнымі выразамі і супакоіўся толькі тады, калі зразумеў, што ў бліжэйшай кнайпе можа купіць лекі ад нерваў. Грам так стопяцьдзясят, ня болей…

Дзяніс Гурыновіч, наадварот, вельмі любіў палітычныя спрэчкі. Гэта яму падымала настрой, як кату валяр'янка. Але на гэты раз і ў Дзяніса настрой быў такі ўзьнёслы, што хацелася падтрымліваць яго як мага надалей тымі ж лекамі, якія настойліва працягвалі спакушаць Сініцкага.

Жаданьні хлопцаў супалі. Праз колькі хвілінаў Юрась з Дзянісам ужо адкаркоўвалі першую бутэльку. На жаль, у добрай кампаніі гэтыя паўлітрухі маюць незразумелую ўласьцівасьць хутка заканчвацца. Сябры ўжо зьбіраліся разьвітацца, як да іхняга століка падышлі два мужчыны і па-беларуску спыталі дазволу прысесьці.

Хлопцы зірнулі на іх і зарагаталі. У адным яны распазналі афіцэра мясцовага ўпраўленьня КДБ...

– З каго сьмяецеся?

– З вас, – адкінуўся на стуле Юрась. – Няўжо ў КДБ абавязкова мець аднолькавыя, як у блізьнюкоў, твары?

– Затое вы ўсе такія розныя, што мы вас нібыта і не пазнаём, – пакрыўдзіўся адзін з афіцэраў. – Вы ж прымітыўныя, як амёбы. Пасядзіце там, на сходках, пагаворыце абы пра што, каб нас заблытаць, а пасьля ў кнайпу тупаеце. Робіце выгляд, што гарэлку п'яце. А мы ж ведаем, што галоўныя размовы якраз тут і адбываюцца.

Цяпер настрой пачаў падымацца і ў Юрася.

– А вас што, падслухаць прыслалі?! – засьмяяўся ён. – Хіба іншага занятку ня маеце? Усе справы парабілі?

Афіцэраў гэтыя словы кальнулі ажно туды, дзе ў кожнага чалавека, незалежна ад прафесіі, знаходзіцца сэрца. Яны заказалі тыя ж лекі, што і апазіцыянеры, і пасьля другой бутэлькі адзін зноў зьвярнуўся да хлопцаў:

– Вы чамусьці думаеце, што толькі бэнээфаўцы Беларусь любяць. А сапраўдныя патрыёты – гэта мы. А вы нам не даяце займацца нашай непасрэднай справай. Я за гэта вас перадушыў бы, як сьляпых катоў. Шкада, што начальства не дазваляе. Працавалі б мы нармальна, як усе людзі. Дык не. Трэба сярод ночы падымацца, бо вы нешта абмяркоўваеце. Дня вам мала!

Добра падпіты афіцэр злосна цяпнуў цэлую шклянку гарэлкі.

– Я вам так скажу. Назіраем мы за вамі даўно. Людзі вы нармальныя. Нашмат лепшыя, чым маё кіраўніцтва. Яно за мной цікуе больш, чым я за вамі. Невыносна стала жыць. Немажліва працаваць у такіх умовах, калі за табой сочаць. А самыя кепскія людзі – гэта даносчыкі. Горшых гадаў, чым стукачы, я ня ведаю. Шасьцёрак стала нашмат болей, чым патрабуе нашая праца. Тэлефануюць, даносяць... А мы на кожны піск стукача-дэбіла рэагаваць мусім. Вось каго трэба зьнішчаць – паганых шасьцёрак. Шкада, што мы бяз іх абысьціся ніяк ня можам.

Афіцэры заплацілі і сумна пасунуліся на выхад.

– Як ты думаеш, чаму яны нас пакінулі? – заліўшы вочы чарговай порцыяй, спытаўся Дзяніс.

– А што ім рабіць, калі мы іх раскусілі, – задумаўся Юрась. – Хлопцы яны сапраўды добрыя, шчырыя. Ёсьць і ў КДБ нармальныя людзі. Але ж работа... Зараз хіба якога стукача, пра якога так кепска гаварылі, да нас падсадзяць.

Хлопцы раптам перавялі позірк на ўваход. Да іх століка, з радасным воклічам: "Прывітаньне! Як я рады вас бачыць!", накіроўваўся адзін з сяброў партыі.

## Законы фізікі

Васіль верыў у справядлівасьць апошняй інстанцыі пошукаў праўды. Начальства даўно хацела выкінуць яго з прадпрыемства. А за што? Рукі ён меў залатыя. За што ня возьмецца, усё атрымліваецца хутка і дакладна. А якому кіраўніку дзяржаўнага прадпрыемства даспадобы мець падначаленага, які можа, умее і робіць, на вачах іншых, усё лепш ад шэфа? А тут яго яшчэ заўважылі пры распаўсюдзе агітацыйнага бюлетэню зусім не таго прафсаюзу, у які патрэбна, паводле меркаваньня ўладных структураў, запісвацца "гегемону". З тых часоў Васіля сталі трактаваць як апазіцыянера і адносіцца гэтак жа. Доўга думаць ня сталі. Узялі і проста выкінулі яго з працы за парушэньне тэхнікі бясьпекі. Маўляў, карыстаўся зварачным апаратам, падключыўшы толькі адзін шланг. А трэба два.

З тэхнічнага боку гэта поўная бязглуздзіца. Зварачны апарат не працуе на адным шлангу. Здавалася, даказаць сваю правату будзе прасьцей, чым зьесьці яблык. Ну і Васіль пачаў судзіцца.

Ён і яго адвакат былі перакананыя, што выйграюць працэс без асаблівых намаганьняў. Ужо з асалодай паціралі рукі, уяўляючы, як дырэктар заводу і адміністрацыя будуць прасіць прабачэньня ды налічваць кампенсацыю за два месяцы незаконнага звальненьня Васіля.

– ...І гэта проста зьдзек, прыдумаць такую прычыну звальненьня, – завяршаў сваю прамову адвакат. – Зварачны апарат на адным шлангу працаваць ня можа, гэтак жа, як ня можа гарэць лямпачка, калі адлучыць адзін з правадоў. Вось, калі ласка, заключэньні эксьпертаў. Гэта законы фізікі. Іх ніхто зьмяніць ня можа. А майго кліента звольнілі за тое, што апарат працаваў на адным шлангу! Абсурд! Гэта ўвогуле немажліва з боку гледжаньня навукі. Гэты працэс можна назваць – “навука супраць адміністрацыі заводу”!

Васілю было нудна і нецікава. Яго роздум перарвала суддзя, прыгожая маладая жанчына:

– Суд выдаляецца дзеля прыняцьця рашэньня, – заявіла яна рашучым голасам.

– Устаць! Суд ідзе! – праз нейкі час загаласіла яшчэ адна жанчына, сакратар суда, якая падчас працэсу нярвова трэсла галавой.

Суддзя ўвайшла, і здалося, што яна зьбіраецца ўзяць удзел у выставе васковых фігураў…

– Суд лічыць, – заявіла яна, – што адміністрацыя прадпрыемства мела падставы для звальненьня. А наконт законаў фізікі, раю даверыцца Эйнштэйну, які даказаў, што ўсё адносна.

Каб магутны розум вялікага аўтара тэорыі адноснасьці мог прадбачыць падобную трактоўку яго навуковага генія, то адразу адмовіўся б працаваць у дасьледчай галіне. Розум жа адваката Васіля падказаў свайму ўладальніку, што больш апазіцыянераў абараняць ня варта. Розум самога Васіля прымусіў яго падысьці да суддзі.

– Скажыце, калі ласка, – спакойна вымавіў ён, – на каго канкрэтна падаваць заяўку на Нобелеўскую прэмію. Што больш правільна, каб прэмію атрымалі толькі вы, ці ўся айчынная судовая сістэма. Вы зрабілі неверагодны прарыў у навуцы. Цяпер можна за некалькі хвілінаў вырашыць усе тэхнічныя праблемы чалавецтва – рашэньнем суда зьмяніць законы фізікі...

– Рашэньнем суда законаў фізікі ня зьменіш, – стомлена зірнула на Васіля суддзя. – А вось работу табе зьмяніць давядзецца.

І выйшла з залы, паўтараючы: “Законы фізікі, законы фізікі…”.

## Дарагія падарункі

Другая палова васьмідзясятых гадоў дваццатага стагоддзя для абываццеляў “сама справядлівай і заможнай” краіны, тавары ў якой можна было набыць толькі па талонах, па “блаце” і адстаяўшы вялікую чаргу, нечакана, нават для яе кіраўніцтва, прынесла нябачаныя на працягу ўсяго ейнага існаваньня зьмены. Галоўным шокам быў нават не абраны кірунак на “галоснасьць” і “перабудову”. Грамадскасьць успрыняла гэта як чарговы жарт адурэлага, прыстарэлага, дастаткова зьдзіцянелага кіраўніцтва з даволі маладым новым генсекам. У гэтыя байкі верылася яшчэ менш, чым у папярэднюю заяву былога сакратара кампартыі аб тым, што цяперашняе пакаленьне будзе жыць пры камунізме.

На кароткі тэрмін стала магчымым вырвацца з моцных лапаў вялікай і неабсяжнай Радзімы і выязджаць за мяжу. І гэта ня толькі камсамольскім ці партыйным наменклатуршчыкам, а каму хочаш… Народ спачатку ажно разгубіўся. Не паверылі людзі. Але пасьля патроху то адзін, то другі паспрабавалі на сабе праверыць праўдзівасьць дазволу. А затым ламанулі на захад калонамі.

А на Беласточчыне польскія беларусы, якія паваявалі за “Салідарнасьць” і справядлівасьць для ўсіх людзей Рэчыпаспалітай, шчыра і наіўна мяркуючы, што ў той

сьпіс увойдзе і беларуская нацыянальная меншасьць Польшчы, з нецярпеньнем чакалі сустрэчы з нацыянальнасьвядомымі братамі па крыві з этнічнай Радзімы. Наіўныя…

Сустрэлі адну з такіх дэлегацыяў на Беласточчыне надзвычай ветліва. Яўген, які тады па маладосьці думаў, што ў Польшчы, дзе ён нарадзіўся, ужо ўсе праблемы будуць вырашацца ў правільным кірунку, і таму ён цалкам можа прысьвяціць сваё жыцьцё толькі беларускім справам, ад радасьці чаканьня тае сустрэчы аж сьвяціўся. Ён да яе адмыслова падрыхтаваўся...

Госьці елі, пілі і дзякавалі. Шчыра зьдзіўляліся аповедам пра згуртаваную і шматколькасную беларускую дыяспару ў Польшчы. Хіба сапраўды шчыра. Бо нават і зараз, праз столькі гадоў, афіцыйныя (не апазіцыйныя) беларускія дэлегацыі зьдзіўляюцца, што і за мяжой ёсьць нейкія беларусы, якія яшчэ ў дадатак размаўляюць па-беларуску. Ну скуль пра гэта ведаць людзям, якія настолькі “талерантныя”, што гатовыя загінуць усім народам, абы вайны не было.

Яўген таксама быў у захапленьні. Галоўным ягоным гонарам былі кніжкі на беларускай мове, якія ўдалося выдаць беластоцкім беларусам і якія ён ад шчырага сэрца прэзентаваў новым знаёмым.

– А вы не баіцеся праз мяжу весьці іх? – запытаў шчасьлівы Яўген. Настрой у яго быў вышэй Эйфелевай вежы. – Бо там разумнікі могуць знайсьці і антысаветчыну?

– Не! – Хорам адказалі госьці. – Мы нічога не баімся. Гэта для нас найдарагія падарункі...

– Ну тады яшчэ вазьміце. Падорыце знаёмым.

Яўгена, паглыбленага ў думкі пра новых знаёмых, ногі прыцягнулі на вакзал. Ён выйшаў на перон і ад убачанага там аслупянеў. Цягнік з “мужнымі” хлопцамі пакідаў Беласток, зьдзекліва махаючы хвастом апошніх вагонаў. А на пероне, на рэйках, на вакзальных лаўках і каля іх… паўсюдна валяліся падораныя кніжкі.

## Расеец

Калі вам часта даводзілася езьдзіць цягнікамі па Беларусі, дык вы з лёгкасьцю зможаце ўявіць адчай Яўгена Міхнюка. Малады хлопец, які вяртаўся з Менску ў Гародню, адчыніўшы дзьверы свайго купэ, убачыў на сваім месцы трох жанчын сталага веку. Яны ўтульна расьселіся на ягонай паліцы і ўсім сваім выглядам паказвалі, што не зьбіраюцца яе саступаць законнаму ўладальніку. Стомлены пасьля правядзеньня несанкцыянаванага мітынгу ў абарону беларускай мовы юнак адразу зразумеў, што заснуць на тым месцы, якое яму гарантаваў куплены білет, можна было б толькі ў адным выпадку – каб ён зайшоў у купэ ў мундзіры нямецкага афіцэра СС. Яўген залез на верхнюю паліцу і вырашыў крыху паспаць.

Такія спакойныя паводзіны юнака адразу выклікалі ў яго спадарожніц нічым невытлумачальную буру нянавісьці і агрэсіі. Адна з пасажырак, твар якой нагадваў галоднага бабра, гучна пачала абмяркоўваць нявыхаванасьць і бездухоўнасьць сучаснай моладзі.

…Пасажыры грамадскага транспарту дзеляцца на пяць катэгорыяў. Адны незалежна ад часу сутак адразу пачынаюць спаць. Другія стараюцца завязаць размову з незнаёмымі і пры нагодзе выпіць з імі пляшку-другую. Трэцяя катэгорыя выкарыстоўвае дарогу дзеля чытаньня. Чацьвёртая дзеля мараў. Яўгенавы спадарожнікі належылі да пятай, выміраючай катэгорыі пасажыраў. Гэтыя людзі, дзе б і куды б ня ехалі, мусяць стогнучы і ікаючы абавязкова штосьці есьці. Пры гэтым іхняя агрэсія да прысутных трохі зьніжаецца, але ўзрастае пачуцьцё пошуку нейкага абстрактнага ворага.

– Добра, што гэтых бэнээфаўцаў ганяюць, – перажаоўваючы жалезнымі зубамі варанае яйка з каўбасой плаўна перайшла да палітыкі пасажырка з тварам галод-

нага бабра. – Дай ім волю, яны вайну распачнуць. Такую вялікую краіну развалілі! А цяпер хочуць стасункі з Расіяй папсаваць.

– Ага. Ды яшчэ сваю беларускую мову хочуць прымусіць вучыць, – жуючы, падтрымала яе сяброўка, гаворачы на такой “расейскай мове”, якую можа зразумець толькі народжаны ў Беларусі чалавек. – Душыць іх трэба, як сьляпых кацянятаў! Хочуць зрабіць нам, як у Прыбалтыцы. А ў мяне сваячка жыве ў Вільні, дык казала, што жыць там цяжка. На гэтых зьлыдняў трэба заўсёды міліцыю выклікаць...

Яўген стараўся не зьвяртаць на размову ўвагі, хоць жылы маладога беларускага патрыёта нацягнуліся ад усяго пачутага. Колькі ён змагаўся, рызыкаваў вучобай і працай, плаціў штрафы і сядзеў у пастарунках за сваю мову, за свой народ, а тут цэлую дарогу мусіць цярпець такое. Але пасьля таго, як кампанія перамыла косьці ўсім апазіцыйным палітыкам, зрабіла высновы, што без Расіі беларусам не пражыць, распавяла пра тое, як выміраюць рэспублікі, якія некалі квітнелі ў СССР, і зрабіла выснову, што беларускай мовай не наясіся, – ня вытрымаў. Але вырашыў пайсьці іншым шляхам.

– Слухаю я вас, і бачу – разумныя вы людзі, – уклініўся ён у размову. Жанчыны ад такой нечаканай пахвалы нават на некалькі хвілінаў перасталі цямкаць. А на юнака спусьцілася натхненьне: – Бачыце, што тыя апазіцыянеры хочуць. Каб мы, беларусы, на сваёй зямлі па-беларуску размаўлялі! А нашто гэта нам?

– Так-так, – пагадзіліся суразмоўніцы, але насьцярожыліся.

– Беларусы – гэта ж ня нацыя, – разышоўся юнак. – За беларускую мову, і нават за тое, што нехта кажа, што ён беларус, трэба кідаць у астрог.

– Тут я з вамі не пагаджуся, – спалоханым нерашучым голасам запярэчыла адна з жанчын.

– Мы ўсё ж асобны народ, але... – паспрабавала падтрымаць яе другая.

– Ах, вось вы як загаварылі! – не супакойваўся Яўген. – Беларусаў надумаліся абараняць. А хто такія беларусы?! У іх жа нічога няма! Без Расіі паздыхаюць, як тыя прыбалты. А можа, вы бэнээфаўкі? Супраць Расіі ідзяце?!

– Мы ня супраць Расіі, – вылупіла вочы Бабровы хвост. – Толькі вы, малады чалавек, дарэмна кажаце, што ў нас няма нічога. У нас усё ёсьць, што нам трэба. І не памром мы бяз той Расіі, завярні яе зямля. Абыдземся неяк. Яшчэ невядома, хто без каго загіне! Ды і прыбалты неяк выжылі. Жывуць ня горш, чым у той Расіі. У мяне ёсьць у Вільні сваячка, дык яна казала, што там ня так ужо і кепска...

– Ага! Я вас раскусіў. Вы апазіцыянеркі. Нацыяналісткі... – Яўген так увайшоў у прыдуманы сабе вобраз, што на хвіліну нават пашкадаваў, што не паступаў на акцёрскі факультэт.

– А ты хто! – зараўлі жанчыны ў тры гарлякі. – Хіба маскаль нейкі! Панаехалі тут нас павучаць! Заткніся, смаркач! Яшчэ слова, і міліцыю паклічам! Паляціш у сваю Расею... Там і будзеш хлябальнік разяўляць. А мы тут і бяз вас разьбяромся!

Яўген так і зрабіў. Заткнуўся. І, лежачы на правым баку, шчасьлівы, аж да Гародні з задавальненьнем слухаў размовы жанчын пра тое, што ён нахабны прыезджы расеец, і што беларусы самі пражыць могуць. Без Расіі. І нават лепш будзе…

## Бліжэй да народу

– Дык вось што я табе скажу, сябра, – сумным голасам пачаў Лявон, нагбом асушыўшы кілішак “Беленькай” і нават не дакрануўшыся да закускі. – Нашыя метады агітацыі – марны лямант. Людзі нас ня чуюць. Я ў роспачы. Ня ведаю, што рабіць. Можа, ня тое мы ім даводзім? Можа, мацней трэба крычаць?

– Крычы ім хоць у самае вуха – не пачуюць. Яны панараджаліся глухімі, – зрабіўшы заклапочаны і зьлёгку дзелавы, як у практыка-псіхолага, твар, заявіў Міхась.

– Колькі ўжо гадоў апазіцыя далбеніць адно і тое ж, а мала хто пачуў. Тут трэба іншыя метады.

– Цікава, якія? – вылупіўся Лявон. – Я ўжо тыдзень чакаю арышту. Сам ведаеш, за што. Мае дзеяньні даўно сядзяць у пячонках улады. Муляюць ім, як каменьчык у боце. Сёньня сваёй жонцы, якая ўжо дзесяць год непасрэдна назірае, чым я займаюся, сказаў, што як не вярнуся вечарам дахаты, то, значыць, мяне забралі. А яна мне ў адказ: “А каму ты патрэбны, каб цябе забіраць. Хіба зьбіраешся жэрці гарэлку з сваімі бесталковымі сябрукамі-апазіцыянерамі, а мне пляцеш усялякія казкі-небыліцы”. Вось і атрымліваецца, што нават блізкія людзі не разумеюць, што ў нас робіцца. Разбалелася ў мяне душа пасьля жончыных словаў. Кажа, гарэлку жэрці буду. Ну то буду! Хоць неяк той боль душы заліць.

– А я думаю, што трэба быць бліжэй да народу, – падняўшы палец левай рукі, а правай паднёсшы чарговы кілішак да вуснаў, глыбокадумна заўважыў Міхась. – Далёкія мы ад людзей. Вось паглядзі. Людзі ў гэтай кнайпе гэтак жа як і мы “ядуць” гарэлку, але не аб праблемах размаўляюць, а весяляцца так, нібы гэта апошняя п’янка ў жыцьці. Адрываюцца на ўсю. Караоке для іх уключылі. Яны сьпяваюць, цешацца жыцьцём. Цэлая кнайпа, знаёмыя і незнаёмыя, як адно цэлае. Толькі мы з табой тут чужародныя элементы. Сядзім, нудзімся. Чаго тады прыйшлі? Паспрабуй пасьпяваць з імі. Можа, тады і мы іх лепей зразумеем, і яны нас.

Лявон падняў вочы. Вакол весяліліся людзі з чырвонымі тварамі. На запыленым і падрапаным экране “караоке” пралятаці словы ненавісных Лявону расейска-папсовых песьняў. Але прысутныя шчасьліва галасілі, то апярэджваючы мелодыю, то спазняючыся за музыкай.

– Зараз я ім зраблю камедыю. Толькі сумняваюся, што яна нас зблізіць, – злосна вымавіў Лявон, махнуў яшчэ кілішак, укліні́ўся ў кампанію “караочнікаў” і, не зьвяртаючы ўвагі на тое, што на экране (пад адпаведную музыку прабягалі словы: “Муси-пуси, муси-пуси, миленький мой...”), зароў хрыплым басам: “А я лягу-прылягу край гасьцінца старога...”. Зароў так, што на століках папераварочваліся кілішкі.

На ягонае зьдзіўленьне, астатнім гарлапанам такая аранжыроўка расейскай папсы прыйшлася даспадобы, і калі на экране паляцелі словы чарговай песьні “Нас не догонят...”, уся кнайпа зараўла ў адзін голас: “Касіў Ясь канюшыну...”.

Здавалася, гэтай забаве ня будзе канца. Кожны хацеў выпіць на брудэршафт менавіта з Лявонам ці Міхасём, і абавязкова пагарланіць каля іх штосьці падобнае на “Кладачка тоненька, вада халодненька, а я малодзенька...”. Ды неўзабаве абедзьве стрэлкі гадзіньніка спыніліся на лічбе 12, што азначала закрыцьцё кнайпы. Гаспадыня толькі разявіла рот, каб абвесьціць пра гэта п’яным наведвальнікам (а іншых папросту не было), як адзін з кліентаў перабіў яе:

– Прапаноўваю выпіць за нашых апазіцыянераў, – падняўшы кілішак, зьвярнуўся ён да ўсіх прысутных. – Я раней і ня ведаў, якія гэта цудоўныя людзі. Толькі сёньня зразумеў. За вас хлопцы! За БНФ. Жыве Беларусь!

– Жыве! За вас, хлопцы! – хорам падхапіла ўся кнайпа. – І хай гаспадыня паставіць на караоке штосьці беларускае.

– Няма ў мяне нічога такога, – зьбянтэжылася гаспадыня, а пасьля махнула рукой і, не зважаючы на расейскі папсовы матыўчык, добра пастаўленым голасам зацягнула: “Ой ляцелі гусі з броду...”.

## Самы гарласты

Затрыманых праводзілі ў кабінет стомленай суддзі цэлымі партыямі. Суд доўга не цягнуўся. Суддзя, яшчэ маладая сімпатычная жанчына, твар якой ня быў сапсаваны інтэлектам, не даслухоўваючы блытаных, чытаных з адной і той жа паперкі сьцьверджаньняў ілжэсьведкаў-міліцыянтаў, выносіла прысуды, кіруючыся хіба што

толькі адным жаданьнем: хутчэй усіх пасадзіць у астрог, каб засталося крыху часу схадзіць у краму купіць на вячэру сардэлек.

Прысудзіўшы па сем сутак арышту чарговай партыі беларускамоўных затрыманых, суддзя з сумам паглядзела на дзьверы, у якія зноў заводзілі некалькі арыштаваных з бел-чырвона-белымі значкамі на кашулях. Іх было трое. Праўда, адзін быў без значка.

– І так... – пазяхнула суддзя.

– Мы былі на працы, і раптам убачылі вось гэтых трох, – пачаў тлумачыць міліцыянт, які ў гэтыя дні па сумяшчальніцтву быў яшчэ і нібыта выпадковым мінаком, і ілжэсьведкам, і яшчэ цалкам легальна падпрацоўваў даваньнем на судзе няпраўдзівых зьвестак. – Яны ішлі па люднай вуліцы і лаяліся нецэнзурнымі словамі.

– Нікуды мы не ішлі, – агрызнуўся адзін з затрыманых. – Вы нас з аўтобусу зьнялі.

– Ну так, – пацьвердзіў другі. – Напалі на нас зьнянацку і павалаклі з аўтобусу ў пастарунак.

Трэці затрыманы нічога не сказаў, а толькі ўзіраўся на ўсё зьдзіўленымі вачыма.

– Якая розьніца, на вуліцы ці ў аўтобусе, – крыху зьбянтэжыўся міліцыянт, але адразу папраівіўся. – Я і кажу, так брыдка мацюкаліся, што амаль усе людзі з кнайпы паўцякалі.

– З якой кнайпы?

– Для асабліва дэбільнатупаватадурных паўтараем: нас узялі ў аўтобусе, – кінуў на міліцыянта першы затрыманы.

– Я так і сказаў, – не здаваўся міліцыянт. – Запомніш тут вас усіх, дзе каго арыштоўвалі. Галоўнае, што памятаю, як вы мацюкаліся. Асабліва вось гэты, які сёньня маўчыць. Спалохаўся! А быў самы гарласты. Найграмчэй крычаў нецэнзурнымі словамі.

– Усё ясна, – перабіла яго суддзя. Яна разглядала свае нафарбаваныя лакам кіпцюры і не жадала перагружаць галаву нейкімі там падрабязнасьцямі гэтай кожнаму зразумелай бруднасфальсіфікаванай справы. Ёй і самой гэтыя працэсы настолькі абрыдлі, што ў думках яна лаялася самымі непрыстойнымі трохпавярхоўнымі нецэнзурнымі словамі, праклінаючы апазіцыю, міліцыю, палітыку, сваю работу, халоднае надвор'е і графік працы крамы з сардэлькамі, дзе акурат сёньня быў скарочаны працоўны дзень... – Ясна, як белы дзень. Віна ваша даказаная, што пацьвярджаецца паказаньнямі сьведкаў. Прысуджаю вам двіам па сем сутак арышту, а трэцяму, самаму гарластаму, які сёньня маўчыць – дзесяць сутак. Хочаце штосьці сказаць?

– Так, хачу! – закрычаў першы асуджаны. – Суд несправядлівы. Справа сфабрыкаваная. Рана ці позна вам давядзецца адказваць...

– Асабліва ілжэсьведкам, – падтрымаў яго другі. – Праўда пераможа. За ўсё адкажаце. Асабліва за несправядлівасьць. Вось гэтага чалавека, які маўчыць, увогуле выпадкова заграблі. Такі быў хапун, усіх падмяталі… А ён нават ня з нашых. Проста ехаў разам у аўтобусе.

– А ўсё справядліва, – заіранізавала суддзя і зьвярнулася да трэцяга асуджанага. – Хто менш лаяўся – менш атрымаў, а хто гарланіў мацней за ўсіх, той больш. Вашая віна даказаная. Можа, вы штосьці сказаць хочаце?

– Можа і хоча, ды ня можа, – усьміхнуліся два асуджаныя. – Ён нямы!

## Сачыненьне

Бяда на гэты раз здрадзіла сваёй даўняй подленькай звычцы падкрадвацца ззаду акурат тады, калі яе ніхто не чакае, і прыйшла дакладна ў чаканы час. Як толькі адпаведныя грамадзянскія структуры абвесьцілі прэзідэнцкія выбары, адразу ж адпа-

ведныя сілавыя структуры пасьпяшаліся заявіць, што з боку беларускай апазіцыі, якую нібыта падтрымлівае ўвесь “паганы” цывілізаваны сьвет, рыхтуецца антыканстытуцыйны пераварот. І што ўсе замешаныя ў ім будуць выкрытыя і жорстка пакараныя. Унутраны вораг будзе разгромлены, зьнешні пасаромлены, а нейкі там яшчэ страшны, невядомы нікому вораг пракляне той дзень, калі нарадзіўся. У гэты дзень беларускае тэлебачаньне толькі тым і займалася, што палохала суайчыньнікаў.

– Хай лепш напалохаюць вожыка голым азадкам, – сплюнуўшы ад злосьці, выключыў тэлевізар Вітаўт. – Ніколі не цікавіўся палітыкай, але зараз пайду шукаць апазіцыю. Абрыдла ўжо вось так жыць, як жывёла ў заапарку, ды ўсяго баяцца. Баяцца нешта сказаць, бо з работы папруць, баяцца на мітынг выйсьці, бо міліцыя забярэ, баяцца...

– Страх – найлепшая страхоўка, – не пагадзіўся з ім яго сусед Валянцін, у якога Вітаўт быў гэтым разам у гасьцях. – І добра, што мы нікуды ня лезем. Палезьлі б, то ўжо сто разоў атрымалі б па рагах і паміж рагоў. Працу згубілі б. А дзяцей карміць трэба. Хто, акрамя нас, імі заапякуецца?

– У тых, хто змагаецца, таксама дзеці ёсьць…

– Ды каб мы пайшлі зараз у апазіцыю, то каму стала б лепш? Нічога гэта не зьмяніла б. Толькі нашкодзіла б. І нам, і нашым дзецям.

Не пасьпеў Вітаўт абгрунтаваць свае высновы, як дзьверы кватэры адчыніліся, і ў хату заляцелі сыны.

– Як там у школе? – у адзін голас запыталіся бацькі.

– Сачыненьне загадалі напісаць, – гэтак жа, у адзін голас, адказалі хлопцы. – І казалі пісаць разам з бацькамі.

– А што за тэма?

– Тэма, як сказала настаўніца, вельмі простая. Пра нашую любімую Беларусь. Пра тое, як яна расквітнела за апошнія гады, і за што мы любім нашае кіраўніцтва. Сказала, што тэма вельмі важная і будзе ўплываць на ўсе адзнакі. Сачыненьні будуць пасылаць аж у міністэрства адукацыі.

– Вось бачыш, – выдыхнуў Вітаўт. – Што я табе казаў... За дзіцячыя душы ўжо ўзяліся. Я цярпець ня буду. Хочуць з бацькамі каб пісалі, ну то я напішу. І пра тое, як я іх ненавіджу, і пра іх урад, і пра выбары. Усю праўду напішу.

– Ты што, – спалохаўся Валянцін. – Ты чуў? Гэтыя сачыненьні на ўсе адзнакі будуць уплываць. Іх жа ў міністэрства адпраўляюць. Лепш напісаць штосьць нейтральнае. Што Беларусь любім за азёры, за лясы і балоты... І ілгаць ня трэба, і адзнаку кепскую не паставяць.

– Пішы пра што хочаш, а я напішу тое, што я лічу правільным. Хопіць маўчаць, – абурыўся Вітаўт, хапіў за руку сына і пайшоў да сябе.

Праз тыдзень сын Валянціна вярнуўся дахаты з апушчанай галавой. Адзнака за сачыненьне была “ніжэй сярэдняй”. Ён распавёў бацьку, што тэма пра лясы і азёры не стасавалася з канцэпцыяй міністэрства. Трэба было пісаць пра прэзідэнта.

– А што ж тады паставілі сыну Вітаўта? – спытаўся бацька.

– Ён атрымаў вышэйшую адзнаку. Настаўніца сказала, што падзяляе погляды ягонага бацькі. І перадавала яму падзяку за выхаваньне сына. Толькі прасіла прабачэньня, што не змагла паслаць сачыненьне ў міністэрства. Недзе згубіла сшытак...